УДК 81*373.232

# БЕЛАРУСКІЯ ІМЁНЫ І ПРОЗВІШЧЫ. ГІСТОРЫЯ ІХ СТАНАЎЛЕННЯ

У. С. ЛЕЎЧАНКА
Навуковы кіраўнік В. В. ПАНЕЖА
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт
Магілёў, Беларусь

У Беларусі імёны і прозвішчы маюць вельмі багатую гісторыю, якая адлюстроўвае культуру нашай краіны. Гэта звязана з тым, што ў розныя перыяды тэрыторыю сучаснай Беларусі насялялі розныя этнасы, якія прынеслі з сабой свае традыцыі і назвы. У архіўных дакументах можна знайсці мноства цікавых фактаў пра тое, як з’яўляліся імёны і прозвішчы ў розныя часы. Большасць беларускіх імён маюць славянскія карані, але таксама існуюць імёны, якія маюць балтыйскія, германскія і іншыя карані.

Большая частка сярэднявечных беларускіх імёнаў дайшла да нас з пісьмовых крыніц часоў Вялікага княства Літоўскага, напісаных на тэрыторыі дзяржавы, якая ўзнікла як аб’яднанне славянскіх і літоўскіх плямёнаў і ўключала ў сябе тэрыторыі сучаснай Літвы, Беларусі, цэнтральнай і заходняй Украіны, а таксама заходніх абласцей еўрапейскай часткі Расіі. Для гэтага перыяду характэрны найменні на аснове паганскіх і праваслаўных звычаяў.

У перыяд аб’яднання Літоўскага княства і Каралеўства Польскага праваслаўе паступова замяняецца каталіцызмам, а заходнерускае – польскім. Сістэма імёнаў на беларускай мове ўскладняецца: да двух ранейшых дадаецца яшчэ адна назва – цяпер паводле каталіцкіх канонаў. Некаторыя імёны, такія як Андрэй, Іван і Пётр, маюць апостальскае паходжанне, а іншыя, такія як Марыя, Кацярына і Надзея, маюць свае карані ў Бібліі.

Першыя ўстойлівыя фамільныя найменні прымаліся магнацкімі родамі з другой паловы XV ст. Гэта старажытныя радавыя імёны: Сапега, Тышкевіч, Пац, Хадкевіч, Глябовіч, Няміра, Ядко, Ілініч, Гарнастай, Грамыка.

У савецкі час у выніку русіфікацыі ў беларускай мове народныя імёны былі выцеснены з афіцыйнага ўжытку праваслаўнымі кананічнымі формамі імёнаў.

У сучасны час людзі выбіраюць прозвішчы, якія адлюстроўваюць іх род занятку ці асабістыя якасці. Сучасныя імёны і прозвішчы знаходзяць сваё прымяненне ў розных сферах жыцця, у спорце, творчасці.

Значэнне беларускіх імёнаў недаацэнена, яны дапамагаюць нам разгадаць таямніцы гістарычных падзей, якія адбыліся некалькі стагоддзяў таму, і вырашыць некаторыя пытанні нацыянальнай самаідэнтычнасці і культуры нашай краіны.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Шур, В. В.** Беларускія ўласныя імёны. Беларуская антрапаніміка і тапаніміка: вучэбны дапаможнік / В. В. Щур. – Мазыр: Выснова, 2018. – 355 с.